ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
5
СТУДЗЕНЯ
№ 1 (1594)

## ТЕЛЕТАЙП

ЎЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

### «ТВОЙ УКЛАД У ПАСКАРЭННЕ І ПЕРАБУДОВУ»

— пад такім дэвізам у партыйных арганізацыях універсітэта праходзіць грамадска-палітычная атэстацыя. Менавіта гэта пытанне было адным з асноўных на апошнім пасяджэнні бюро парткома. Прысутныя сышліся на думцы, што да атэстацыі патрэбна падыходзіць комплексна, шырэй выкарыстоўваць такія формы, як справаздачы камуністаў на партыйных сходах, бюро, а таксама далей практыкаваць абмеркаванне і зацвярджэнне характарыстык.

У плане выканання прымаемых рашэнняў разгледжаны ход рэалізацыі пастановы бюро парткома ад 24 лютага 1988 года «Аб ходзе выканання патрабаванняў антыалкагольнага заканадаўства і пастановы бюро парткома ад 24 чэрвеня 1987 г.». Звернута ўвага на недастатковую работу ў некаторых падраздзяленнях па папярэджанню парушэнняў антыалкагольнага заканадаўства і адзначана неабходнасць наладзіць эфектыўную работу таварыства барацьбы за цвярозы лад жыцця. А каардынацыя ўсёй работы ўскладзена на савет прававога выхавання і прафілактыкі правапарушэнняў універсітэта.

І яшчэ адно пытанне было вырашана на пасяджэнні бюро парткома — зацверджаны план прапаганды грамадзянскай абароны сярод супрацоўнікаў універсітэта на 1989 год.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ

па выкананню Пастановы ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 24 лютага 1988 года «Аб мерах па ўдасканаленню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў» расказаў на пасяджэнні вучонага савета універсітэта дэкан факультэта журналістыкі А. Г. Слука.

М. АНДРЭЕЎ.

### УРАЧЫСТЫ СХОД

прадстаўнікоў працоўнага калектыву універсітэта, прысвечаны 70-годдзю ўтварэння БССР і Кампартыі Беларусі, адкрыў рэктар, акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі.

З дакладамі выступілі: загадчыца кафедры гісторыі БССР, прафесар І. О. Царук — «Беларусь у сям'і братніх народаў»; загадчык кафедры гісторыі КПСС, прафесар У. К. Коршук — «Уклад працоўных Беларусі ў перабудову і паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны»; прарэктар універсітэта С. А. Малевіч — «Адукацыя і навука Беларусі».

Перад удзельнікамі сходу выступіў народны хор супрацоўнікаў.

З. МІХНЕВІЧ.



НЯДАЎНА мне давялося пабываць у школе юных фізікаў. Прыйшлі сюды ў асноўным вучні дзевятых класаў. На маё пытанне, што прывяло іх у школу, Алена Барышэўская, напрыклад, адказала:

— Мне падабаецца фізіка і я лічу, што для тых, хто цікавіцца гэтым прадметам, у школе даюць недастаткова ведаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## ТВАЕ СУПРАЦОЎНІКІ, УНІВЕРСІТЭТ

### СПАКОЙНА ЖЫЦЬ ЁН НЕ ЎМЕЕ

Многія ветэраны вайны і працы працуюць у нашым універсітэце. Ёсць такія і на кафедры грамадзянскай абароны. Гэта людзі з вялікім жыццёвым вопытам. Прыемна ўсведамляць, што яны душой хвараюць за перабудову, актыўна ў ёй удзельнічаюць.

Адзін з такіх людзей — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, выкладчык, камуніст Леанід Пракопавіч Янаў. Нялёгкі ў яго лёс. Сын рабочага, ён быў прызваны ў армію ў 1938 годзе. На франтах Вялікай Айчыннай вайны з кастрычніка 1941. Удзельнічаў у баях пад Масквой, Ржэвам, Вязьмай, у вызваленні Смаленскай вобласці і Беларусі, быў цяжка паранены. За праяўленую мужнасць, адвагу і гераізм, умелае планаванне баявых дзеянняў Стралковага палка Л. П. Янаў узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны І ступені, Чырвонай Зоркі і многімі медалямі.

Палкоўнік Л. П. Янаў закончыў у свой час ваенную акадэмію імя Фрунзе, 19 гадоў працаваў на выкладчыцкай рабоце ў гэтай жа акадэміі, потым у іншых ваенных установах. І вось ужо дваццаць пяць гадоў Леанід Пракопавіч працуе выкладчыкам у БДУ імя У. І. Леніна. Яго вызначаюць дзіўная працаздольнасць, грамадская актыўнасць, прынцыповасць. Камуністы кафедры не адзін раз выбіралі яго сакратаром пярвічнай партыйнай арганізацыі, ён заўсёды апраўдваў іх давер. Зараз Леанід Пракопавіч — намеснік сакратара партыйнага бюро. Шматгадовы вопыт яго работы дапамагае калектыву кафедры паспяхова спраўляцца з пастаўленымі задачамі.

В. ПУСТАВІТ,
сакратар партбюро кафедры грамадзянскай абароны,
удзельнік вайны.

## РОДНАЯ МОВА

### У камісію ўвайшлі

Ва універсітэце створана камісія рэктарата і парткома па развіццю беларуска-рускай двухмоўнасці. У яе састаў увайшлі: Багданаў У. С.— прарэктар (старшыня); Часноўскі М. Э.— намеснік сакратара парткома (намеснік старшыні); Шакун Л. М.— прафесар філфака, доктар філалагічных навук; Шуба П. П.— прафесар філфака, доктар філалагічных навук; Супрун А. Я.— прафесар філфака, доктар філалагічных навук; Навойчык П.— студэнт філфака; Запрудскі І.— студэнт філфака; Наркевіч А. І.— прафесар журфака, доктар філалагічных навук; Цікоцкі М. Я.— прафесар журфака, доктар філалагічных навук; Царук І. О.— прафесар гістфака, доктар гістарычных навук; Шупляк П. А.— дацэнт гістфака, кандыдат гістарычных навук; Вітушка С.— студэнт гістфака; Бельскі А. М.— дацэнт фізфака, кандыдат фізіка-матэматычных навук; Данейка І. К.— дацэнт факультэта радыёфізікі і электронікі, кандыдат фізіка-матэматычных навук; Балашэнка С.— намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта; Гусак А. А.— прафесар мехмата, кандыдат фізіка-матэматычных навук; Бяспалы А. А.— старшы выкладчык геафака; Марозік М. С.— дацэнт біяфака, кандыдат біялагічных навук; Юхо І. А.— прафесар юрфака, доктар юрыдычных навук; Лойка А. А.— прафесар філфака, доктар філалагічных навук; Смяян І. У.— загадчыца рэдакцыі літаратуры, філалогіі і педагогікі выдавецтва «Універсітэцкае».

## АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

### Кніжны голад

Ад гэтага слова — шчыра прызнаюся — у мяне адразу перасыхае ў горле. Чаму? Ды таму, што сама я — студэнтка першага курса. А хто ведае, можа, на самой справе, добра здаць сесію — гэта зрабіць геройскі ўчынак?

З такімі думкамі я назіраю за тым, як рыхтуецца універсітэт да здачы сесіі.

Напрыклад, бібліятэкары. Прыток студэнтаў у чытальныя залы рэзка ўзрастае. А яны ў час сесіі будуць працаваць і ў выхадныя дні. Акрамя таго, некалькі аўдыторый галоўнага корпуса заняты пад чытальныя залы.

І патрэбнай літаратурай, па словах бібліятэкараў, забяспечваюць амаль усіх. Студэнты ж хімфака паскардзіліся, што многіх падручнікаў няма.

Пры праверцы каталога аддзела камплектавання я даведалася, што «неіснуючай» кнігі Радаева «Палітэканомія» паступіла ў бібліятэку 1700 экземпляраў. Значыць, дрэнна студэнты глядзелі на паліцах? Але вось «Хімічная прамысловасць БССР» (выданне 1988 года), даведнік «Навукова-тэхнічны прагрэс» 1988 года таксама адсутнічалі. Акрамя таго, замест некалькіх кніг выдання 1987 года былі 1985—1986 гг. Аказалася, што ніякай віны аддзела камплектавання тут няма. Самі выкладчыкі павінны былі зрабіць заяўкі на новыя кнігі. Не прадугледзелі яны, што студэнтам давядзецца марнаваць час у пошуках патрэбнай кнігі ў розных бібліятэках горада.

Узяць, напрыклад, падручнік «Старажытная беларуская літаратура». Аб ім мараць амаль усе першакурснікі факультэта журналістыкі. А такіх кніг ёсць па шэсць-сем, выдання 1965 і 1978 гадоў. Вось і напішы заліковую кантрольную, а затым здай экзамен. Мусіць, само выдавецтва не зацікаўлена ў тым, каб звярнуліся мы да старажытных часоў нашай культуры. А сесія ўжо пачынаецца. І без віны вінаватымі будзем у час яе мы, студэнты.

Алена КУЛЕШ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

### А есці хочацца заўсёды

Некалькі слоў аб стварэнні маладзёжнага цэнтра на базе кафэ «Гаўдэамус» і сталовай, што ў сёмым інтэрнаце. Амаль усе студэнты супраць. Магчыма, яны не глядзяць у перспектыву? Яны ж дакладна ведаюць, што ў гэты маладзёжны цэнтр на дыскатэку хадзіць не будуць, а есці хочацца сёння, заўтра і кожны дзень. Ды й ці шмат народу ў той «Гаўдэамус» сёння заглядвае? Ці будзе акупляцца цэнтр? У кожнага дзяжурнага ёсць сябры. Ці хопіць там месца для універсітэцкіх? Туды ж і цяпер ходзіць невядома хто.

В. ВАЛОДЗІН,
студэнт філалагічнага факультэта.

### Навошта географу мова?

Першакурсніка здзівіць лёгка. Гэта і зразумела: што ні прадмет, то новае, невядомае. Колькасць выкладаемых дысцыплін, у параўнанні са школьнай праграмай, здаецца неймаверна вялікай і па ўсіх — залікі, залікі, залікі (у лепшым выпадку). А ў іншым — экзамены.

Курс — агульнаадукацыйны. Нічога не папішаш. Спачатку патрэбна авалодаць усім пакрысе. Нават правілы вулічнага руху ўводзяць у рамкі праграмы для першакурснікаў. Смешна, дзіўна і не зусім зразумела. І ўсё ж не гэты прадмет выклікаў усеагульную сенсацыю. Найбольш здзівіла мяне і многіх маіх сяброў выкладанне беларускай мовы і літаратуры. Асабіста я не супраць роднай мовы (здаў, як і належыць, залік), але вывучаць яе на геафаку, ды яшчэ ў вытворчай групе? Не, гэта марная трата часу. Ці не лепш выкарыстаць яго на падрыхтоўку спецыяльных прадметаў? А родную мову і літаратуру вывучаць самастойна. Калі ёсць ахвота. А калі яе няма? Мы проста здалі залік і з палёгкай уздыхнулі: «Яшчэ адна фармальнасць пераадолена».

Кірыл ШАЎЧУК,
студэнт геаграфічнага факультэта.

## У наступным нумары чытайце:

Вядомы беларускі паэт XIX стагоддзя Францішак Багушэвіч казаў: «Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, а потым зусім замерлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі!».

І сёння мы адчуваем, што гэта не проста словы. Вывучэнне мовы — гэта не толькі набыццё ведаў, але і далучэнне да нацыянальнай гісторыі, культуры. На жаль, «моўная хвароба» прагрэсіруе. Як ліквідаваць яе?

Усё часцей і часцей гучаць прапановы: патрэбна пачынаць з дзіцячых садоў, школ. Неабходна прывіваць дзецям любоў да роднага слова, заахвочваць у вывучэнні беларускай мовы, а не наадварот: прапаноўваць пісаць заявы, каб выкрасліць яе са спісу школьных прадметаў.

Усё гэта так. Але хто ж будзе вучыць дзяцей? Безумоўна, педагогі, якіх рыхтуе вышэйшая школа. Вось чаму сёння ў ВНУ, асабліва на педагагічных спецыяльнасцях, так востра паўстае пытанне больш шырокага выкарыстання беларускай мовы. Не застаецца ў баку ад гэтай праблемы і універсітэт. У наступным нумары мы друкуем

«ПРАПАНОВЫ ПА РАЗВІЦЦЮ БЕЛАРУСКА-РУСКАЙ ДВУХМОЎНАСЦІ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ» І ЗАПРАШАЕМ ВАС ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У ІХ АБМЕРКАВАННІ. ЧАКАЕМ ВАШЫХ ЗАЎВАГ, МЕРКАВАННЯЎ, ПРАПАНОЎ.

*З боку выступаючых ацэнка праекта была негатыўнай. Крытыкавалі за перагружанасць агульнымі фразамі, заўважалі недакладнасці, не згаджаліся з мэтай «Нашай пазіцыі». Усё было. Адсутнічала, на наш погляд, толькі канструктыўнасць. Стваралася крытыка з адмаўленняў. Не хапала крытыцы прапаноў. Складвалася ўражанне, што не ўсе прысутныя ўсведамлялі чаго хочуць ад гэтага абмеркавання. Пытанне: навошта нам патрэбна «Наша пазіцыя», для асноўнай масы заставалася загадкай.*

*А гэта была першая спроба распрацоўкі праграмы камсамола ў перабудове, платформы камсамольскай фракцыі вучонага савета універсітэта.*

**На дыскусійнай пляцоўцы «Беларускага універсітэта» — праект праграмы «Наша пазіцыя»**

## Не мроя

Самакіраванне ўжо не мроя. У тых выпадках, калі студэнты адважваюцца з ім сябраваць. Скажам, журфак з новага семестра будзе працаваць па-новаму. Пасля працяглага вывучэння вучэбных планаў, камітэт камсамола распрацаваў праграму, якую, дарэчы, ужо зацвердзілі на вучоным савеце факультэта. Уводзяцца прамежкавыя залікі па тых прадметах, якія патрабуюць доўгачасовага вывучэння, творчы дзень без дадатковых пар у астатнія.

Як суадносіць рэальную работу з палацамі, намаляванымі ў «Нашай пазіцыі»? Заняткі па індывідуальных планах падыходзяць не для ўсіх студэнтаў. Толькі для тых, хто паспеў зарэкамендаваць сябе на папярэдніх сесіях.

Выклікае вялікія сумненні і вырашэнне пытання аб перадачы факультэту журналістыкі будынка па вуліцы Свярдлова. Нам больш падабалася ідэя аб перадачы старога будынка Дома палітасветы. Корпус, у якім мы зараз жывём на правах беднага сваяка, вельмі стары. Разгарнуць у ім тую матэрыяльна-тэхнічную базу, якую плануем мы, немагчыма. Патрэбна іншае памяшканне.

Пытанне аб інтэрнатах. Вось што адзначана ў «Нашай пазіцыі»: «Існуючыя ўмовы пражывання ў інтэрнатах з'яўляюцца крытычнымі. Груба парушаны санітарныя нормы...» Я скажу болей: менавіта гэтыя санітарныя ўмовы перашкаджаюць нам засяляць студэнтаў. Таму што па санітарных нормах патрэбна высяляць людзей з бытавых і ленінскіх пакояў на вуліцу. А жыць ім няма дзе. Менавіта яны не дазваляюць засяляць у блок дзве сямейныя пары. Нельга і ўсё. Пастанова такая ёсць.

І яшчэ. Трэба канкрэтна і дакладна вызначыць пытанне аб рабоце камендантаў інтэрнатаў. Чыя дзейнасць часам накіроўваецца на тое, каб зняважыць студэнта, знішчыць яго як асобу. А розныя рэйды? Калі ў ваш пакой у адзінаццаць гадзін вечара заходзіць правяраючы і робіць заўвагу, што гэты касцюм вісіць не на тым месцы, а падручнік на ложку — антысанітарныя ўмовы,— як да яго ставіцца?

Камітэт камсамола прапануе тэзіс аб роўнасці савецкіх і замежных студэнтаў і засяленні ў інтэрнацыянальныя інтэрнаты. Пакуль за праступкі караецца толькі савецкі студэнт, роўнасці не дасягнуць. Я падтрымліваю прапанову аб замацаванні аднаго пакоя за студэнтам на ўсе пяць гадоў вучобы, але прынцып рассялення, пры якім савецкія і замежныя студэнты самі выбіраюць з прадстаўніком якой краіны ім жыць, уносіць столькі блытаніны і непаразуменняў, што выдзяленне замежным студэнтам пакояў на некалькіх паверхах, здаецца мне, больш падыходзіць.

Я. БЕКЛЯМІШАЎ,
сакратар камітэта
камсамола факультэта
журналістыкі.

## А калі за дзевяць тыдняў?

Наш факультэт таксама не застаўся раўнадушным да абмеркавання «Нашай пазіцыі». Мне здаецца, ацэньваць трэба не столькі дэталёвую распрацоўку праграмы, колькі тое, што ва універсітэцкага камсамола яна з'явілася. З-за яе адсутнасці камітэт доўгі час жыў без свайго палітычнага твару, страчваў аўтарытэт.

Даўно вядзецца на фізфаку дыскусія. У ёй удзельнічаюць выкладчыкі, студэнты, прадстаўнікі дэканата. Мы выступаем за павелічэнне стыпендыі тым, хто займаецца на ваеннай кафедры. Простая логіка разважанняў падказвае, што выконваючы большую нагрузку павінен атрымліваць і больш грошай. Да таго ж, атрыманая «тройка» па «ваенцы» найчасцей і наогул пазбаўляе студэнта стыпендыі.

Заняткі на кафедры нам патрэбны. Але навошта расцягваць іх на тры гады? Прайсці гадавы курс за два-тры тыдні пасля працоўнага семестра намнога зручней. Патрабуюць удасканалення вучэбныя планы кафедры. Гадзіны, адведзеныя на самападрыхтоўку, нагадваюць заняткі ў групе падоўжанага дня. А навошта яны, калі чалавек паспявае? Скажу і пра адтэрміноўку ад ваеннай службы. Хто служыў, ведае, як цяжка, праслужыўшы радавым салдатам па адной спецыяльнасці, асвойваць яшчэ адну на ваеннай кафедры. Фізічны факультэт выступае за больш рэзультатыўную і карысную службу. Ці служба ў Савецкай Арміі і вызваленне ад ваеннай кафедры. Ці заняткі на ёй і абавязковая служба пасля заканчэння універсітэта. Прапануем такі пункт у праект «Нашай пазіцыі».

Л. МАРКОВІЧ,
сакратар камітэта
камсамола фізфака.

## Слоўны ланцужок

Узяць хаця б самую першую прапанову: «Стварэнне ўмоў для жадаючых вучыцца, а не прымус тых, хто не хоча ці не можа». Вось такіх выказванняў мы ўжо — быў час — наслухаліся. І пастаноў напрымаліся. Святкаваць дзень нараджэння чарговай?

Я лічу, што распрацоўваючы праграмны дакумент, патрэбна закранаць усе праблемы, якімі займаецца камітэт камсамола. Добра, што турбуецца ён аб раскошным аснашчэнні вылічальнай тэхнікай факультэта прыкладной матэматыкі. Для нас гэта пытанне і сапраўды гучыць вельмі сур'ёзна. Але цікава мне было б ведаць, што канкрэтна зможа зрабіць камітэт камсамола для таго, каб наш факультэт атрымаў вылічальную тэхніку?

Прымаць «Пазіцыю» можна толькі пасля грунтоўных дапрацовак.

А. БЯЛЯЕВА,
сакратар камітэта
камсамола ФПМ.

## Пяцьдзесят ці сотню?

Асабіста я супраць такой праграмы. Яна датычыць усіх, акрамя аднаго чалавека — радавога камсамольца. І выконваць яе будуць усе: ад камсамольскіх работнікаў універсітэта да камітэтаў камсамола факультэтаў. Камсамольцаў выкладзеныя праблемы не закрануць. Што ім бліжэй?

Вось стаяць побач на плошчы педагагічны інстытут і універсітэт. Чым адрозніваюцца? У першым студэнты вучацца чатыры гады, у другім — пяць. Сустракаюцца потым у адной вёсцы, выкладаюць у адной школе. Чаму б не правесці пасля чатырох гадоў навучання прафесійны адбор і не пакінуць найбольш здольных у навуцы? Мы згодны аддаць у эксперымент свой факультэт. Стварыць сістэму кандыдатаў у студэнты. Каб два гады студэнты набіралі модулі па агульнаадукацыйных дысцыплінах, навуцы, грамадскай дзейнасці. Няхай будзем набіраць сто, а выпускаць пяцьдзесят. Упэўненасць у заўтрашнім дні да дабра яшчэ нікога не прыводзіла. Расхаладжвае, перашкаджае працаваць.

Г. КАВАЛЕЎСКІ.

## Падумаем...

Я не дадумваю, не стаўлюся прадузята. Толькі назіраю за выступленнямі. І пераконваюся: у такім выглядзе «Пазіцыю...» не прымаюць многія. Праграма Маскоўскага універсітэта вылучаецца цэласнасцю. Распрацоўвалі яе самі студэнты. Яны маглі дазволіць сабе раскошу стварыць такую праграму, за якую не сорамна перад усёй краінай.

Самае галоўнае не ў колькасці і дакладнасці пунктаў і параграфаў, а ў тым, што назваць нашу камсамольскую арганізацыю цэласнай можна толькі з вялікай нацяжкай. Таму я сумняваюся: магчыма, яна не падрыхтавана да стварэння адзінай пазіцыі. Пэўна і не трэба. Няхай апарат выпрацоўвае сваю праграму дзейнасці — студэнты могуць яе ўлічваць, могуць — не. Камітэты камсамола факультэтаў ствараць свае «Пазіцыі», грунтуючыся на канкрэтных праблемах. Дазволім кожнаму факультэту самастойнасць. Таму што цяперашнія раздзелы студэнтам (як справы ад іх далёкія) не баляць. Я таксама гэтым здзіўлены. Разлічваў: будуць лісты, сходы, спрэчкі. Відавочна ж: выкладзеныя ў праграме прапановы не мяняюць сутнасці. Гэта той самы мізэр, які павінен быў абрасці. Не аброс. Дык, магчыма, і не быў патрэбным? А ўвогуле, навошта раптоўна вырашаць. Падумаем...

В. КЛЯЦКОЎ,
выкладчык кафедры
палітэканоміі і
прыродазнаўчых
факультэтаў.





**УСЛЫХ АБ**

## ...вольным наведванні

«Вольнае наведванне немагчыма. Не столькі па несвядомасці студэнтаў, колькі па непадрыхтаванасці выкладчыкаў. Кожны з іх жадае, каб яго курс наведвалі абавязкова. Таму негатыўныя адносіны да сябе заслужыць нават «узаконены» прагульшчык».

«Студэнт Беларускага універсітэта — гэта вам не студэнт Гарвардскага. Калі ўвечары ён позна лёг спаць — раніцай пры вольным наведванні ніякая сіла не падніме яго з ложка. Паглядзім на рэчы рэальна: так будзе, калі не з'явіцца, нарэшце, канкурэнцыя за месца ў студэнцкай аўдыторыі».

«Я выкладчык. Але калісьці быў студэнтам. Выкладчыку, у прынцыпе, не так ужо і важна, колькі наведвальнікаў у аўдыторыі. Ён ацэньвае сваю работу па колькасці слухачоў. І слухачоў уважлівых. Хутчэй за ўсё падвядзе непадрыхтаванасць студэнтаў, якія пакуль не адчуваюць рэальнай аддачы ад вучобы, да вольнасці».

## Расчыніў бы дзверы...

**Каментарый загадчыка аддзела студэнцкай моладзі ЦК ЛКСМБ А. Данілава**

Гэта першая спроба ўзняцца над «цякучкай», адчуць сябе палітычнай арганізацыяй, выказаць свае адносіны да таго, што адбываецца ў грамадстве. І ўсё ж большасць камсамольцаў (самі бачыце па абмеркаванню) праграму не прыняла. Пэўна, з-за недакладна акрэсленай мэты яе стварэння, падрыхтоўкі праекта вузкім колам, дакладней, апаратам, і позірку на праблемы з пазіцый таго ж самага апарату.

Пакуль я чытаў «Нашу пазіцыю», прысутнічаў на пленуме, сам пачаў глядзець на яе вачыма стваральніка. Дык вось, я б не дазволіў, каб маёй праграме не хапала смеласці і адкрытасці. Выпрацаваў бы ўласны погляд на ацэнку гісторыі. У час работы над праграмай адчыніў бы дзверы камітэта камсамола, каб заходзілі туды з першачарговымі варыянтамі праекта і фізікі, і філолагі, і журналісты. Больш катэгарычна паставіў бы пытанні аб сельгасработах, матэрыяльна-тэхнічнай базе, засяленні ў інтэрнаты. І выйшаў бы (без дэкларавання) з канкрэтнымі прапановамі ў вучоны савет, рэктарат, савет народных дэпутатаў.

Не імкнуўся б капіраваць і не спяшаўся б з абмеркаваннем. Тэзісы маскоўскай «Нашай пазіцыі» памножыў бы і прапанаваў для азнаямлення, распрацаваўшы ўласную тэарэтычную платформу. Адмовіўся б ад паспешлівасці ў зацвярджэнні. Паспрабаваў бы праграму ў дыскусійных клубах, нефармальных групах, у інтэрнатах, у час заняткаў па грамадскіх дысцыплінах. Не баяўся б варыяцый на манер розных факультэтаў. Сёння можна выкарыстоўваць розныя формы. І, нарэшце, толькі тады, калі б праект стаў пазіцыяй большасці, акумуляраваў бы ў ім усе грунтоўныя выказванні.

# Пасля заняткаў — у школу

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).



Кіраўнік, асістэнт кафедры агульнай фізікі Тадэуш Альфонсавіч Пяркоўскі лічыць, што асноўная мэта школы — прывіць у навучэнцаў любоў да фізікі. Рабяты слухаюць лекцыі, рашаюць задачы, знаёмяцца з рознай апаратурай. Найбольш здольныя і добра засвоіўшыя школьны курс фізікі змогуць удзельнічаць у правядзенні навуковых даследаванняў пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў кафедры. А тыя, хто цікавіцца, скажам, ЭВМ, вучацца праграміраванню і складанню праграм для школьнага курса фізікі.

Л. АНТУХ.







ПОЗІРК З-ПАД БРЫВА

# ХТО ФІЛФАКУ ДАПАМОЖА?

*Ва ўсе часы універсітэты былі асяродкамі навукі і культуры, прыхільнікамі пашырэння асветы. Сарбона і Оксфард, Пецярбург і Кембрыдж праславіліся найперш слаўнавядомымі матэматыкамі і філосафамі, гісторыкамі і біёлагамі, філолагамі і медыкамі. Шмат хто і з беларусаў вучыўся ў гэтых і іншых сусветна вядомых вышэйшых навучальных установах. Варта толькі нагадаць імёны Францыска Скарыны і Яфіма Карскага, Сымона Буднага і Кастуся Каліноўскага, Мялеція Сматрыцкага і Браніслава Тарашкевіча...*

Новай старонкай у гісторыі беларускага краю было адкрыццё ў 1921 годзе Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які стаў важнейшым навукова-даследчым і культурна-асветніцкім цэнтрам у рэспубліцы. Сярод першых выкладчыкаў БДУ былі такія вядомыя вучоныя і дзеячы культуры, як У. Перцаў, І. Замоцін, М. Нікольскі, М. Прыляжаеў, М. Янчук, народны пісьменнік БССР Якуб Колас. Цяжка назваць галіны ведаў, куды б значны ўклад не ўнеслі выхаванцы універсітэта, сярод якіх ёсць і акадэмікі АН СССР, ганаровыя дактары многіх еўрапейскіх універсітэтаў і навуковых таварыстваў, кіраўнікі камуністычнай партыі і савецкай дзяржавы, дыпламаты, вядомыя работнікі народнай гаспадаркі.

З першых дзён свайго існавання БДУ стаў прыцягальным цэнтрам для творчай моладзі рэспублікі, той стартавай пляцоўкай, з якой пачаўся шлях у вялікую літаратуру А. Александровіча і А. Адамовіча, П. Броўкі і Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна і Н. Гілевіча, К. Крапівы і М. Матукоўскага, А. Вярцінскага і П. Труса, К. Чорнага і В. Якавенкі. Бадай ці не большая палова членаў Саюза пісьменнікаў БССР вылецела з-пад крыла БДУ. Нястомным прапагандыстам роднай мовы і літаратуры, даследчыкам і раўнівым захавальнікам багацейшай духоўнай спадчыны народа з'яўляецца філалагічны факультэт універсітэта. Тысячы яго выпускнікоў працуюць у вясковых і гарадскіх школах, прывіваюць любоў да зямлі беларускай, яе звонкай мовы. Універсітэт ганарыцца імі,— якія і ў жорсткія часы сталіншчыны, і ў нялёгкія гады застою змаглі выстаяць, захаваць і сваю чалавечую годнасць, і высокі прафесіяналізм, і зараз з новымі сіламі прыступаюць да адраджэння нацыянальнай самасвядомасці, да вяртання беларусам іх культурна-гістарычнай спадчыны, роднай мовы.

Сёння Беларускі дзяржаўны універсітэт знаходзіцца ў экстрэмальных умовах. Раскіданы па розных кутках г. Мінска, ён на працягу апошніх пяцігодак не атрымаў ніводнага квадратнага метра вытворчых плошчаў. І гэта пры тым, што значна павялічыўся набор студэнтаў па асноўных спецыяльнасцях, узрос тэхнічны ўзровень навучання, з'явіліся новыя навукова-даследчыя падраздзяленні. Зацверджаныя на Бюро ЦК КПБ «Асноўныя мерапрыемствы па далейшаму развіццю народнай асветы ў Беларускай ССР» прадугледжваюць істотнае пашырэнне ў рэспубліцы беларускай мовы, значнае павелічэнне ў бліжэйшы час падрыхтоўкі спецыялістаў-філолагаў. І філалагічны факультэт да вырашэння падобнай задачы рыхтуецца і гатовы. Гарантам таму — высокі навукова-педагагічны ўзровень кадраў прафесарска-выкладчыцкага саставу факультэта, значныя поспехі ў справе падрыхтоўкі і выдання вучэбнай і метадычнай літаратуры, падручнікаў і дапаможнікаў па беларускай мове і літаратуры, жаданне кожнага працаваць яшчэ лепш. Стрымлівае адно — адсутнасць колькі-небудзь прыдатных умоў працы, проста-такі жахлівае становішча з вытворчымі плошчамі. На сённяшні дзень на кожнага студэнта філфака прыпадае ўсяго толькі 0,5 квадратнага метра плошчы. Заняткі ў корпусе на Чырвонаармейскай, 6 праходзяць у тры (!) змены, з парушэннем усякіх магчымых нормаў працы. Самы вялікі факультэт універсітэта, на якім займаецца амаль 2200 студэнтаў, туліцца ў 28 аўдыторыях пры наяўнасці 120 акадэмічных падгруп. Вось і паспрабуйце тут забяспечыць нармальны вучэбны працэс! Каб даць кансультацыю замежным студэнтам і аспірантам (а іх у нас больш двухсот з 19 краін свету), выкладчыкі ўмудраюцца «працаваць» у калідорах, займаюцца адначасова ў кожным з чатырох куткоў актавай залы, а некаторыя выкарыстоўваюць нават Галоўпаштамт. Не даводзіцца і гаварыць пра паўнацэннае харчаванне студэнтаў у маленечкім буфеце на 20 месц.





Усе афіцыйныя спробы змяніць становішча на факультэце вынікаў не далі. Студэнты факультэта сабралі больш 600 подпісаў і звярнуліся ў Савет Міністраў БССР і Вярхоўны Савет рэспублікі з просьбай аказаць найхутчэйшую дапамогу факультэту. Яшчэ ў красавіку 1988 года кіраўніцтва факультэта, буйнейшыя вучоныя-філолагі звярнуліся з пісьмом у ЦК Кампартыі Беларусі. Аднак нават адказу мы не атрымалі, не гаворачы ўжо пра адпаведныя меры. Затое фешэнэбельная гасцініца па суседству амаль пустуе, пабудаваўся непадалёку новы корпус БЕЛТА, які ў свой час «адхапіў» значную частку ў агульным з намі корпусе.

Не можа нас задаволіць і далёкая перспектыва лепшых умоў працы і вучобы, якая вынікае з прынятай пастановы ЦК КПБ па развіццю матэрыяльнай базы універсітэта (дарэчы, колькі такіх пастаноў ужо было!).

Ці ёсць хоць які рэальны выхад са становішча? На факультэце па-ранейшаму ўпэўнены, што было б зусім заканамерна перадаць філфаку былы корпус Дома палітасветы па вуліцы Янкі Купалы (па чутках, ён перадаецца Рэспубліканскаму савету ветэранаў). Падобнае рашэнне дазволіла б перавесці сюды аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры, працаваць побач з музеем і скверам Янкі Купалы — месцам, дарагім кожнаму жыхару рэспублікі і філолагу-беларусаведу. Можна весці таксама і гутарку пра вызваляемы будынак былога Інстытута гісторыі партыі, які знаходзіцца насупраць факультэта.

Ад таго, як будзе вырашана гэта пытанне, залежыць не толькі сённяшні дзень філолагаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, але і лёс нацыянальнай мовы і літаратуры ў будучым.

**М.ПРЫГОДЗІЧ,**
**сакратар партыйнага бюро філалагічнага факультэта, дацэнт кафедры беларускай мовы.**






ЧАС. ЛЁС. ЖЫЦЦЁ

*Матэрыял пра прафесара А. Смоліча — першая публікацыя ў адказ на зварот партыйнага камітэта дапамагчы ў рабоце па выяўленню імён выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта, якія былі падвергнуты рэпрэсіям у 30-х — пачатку 50-х гадоў. Ім мы адкрываем новую рубрыку «Час. Лёс. Жыццё».*

# Прафесар Смоліч

Прозвішча прафесара Аркадзя Антонавіча Смоліча сёння мала што гаворыць нават спецыялісту-географу. Яго нельга знайсці ў энцыклапедыі, мала хто чытаў яго кнігі, а між тым гэты чалавек пакінуў глыбокі след у беларускай геаграфіі 20-х гадоў.

Аркадзь Антонавіч Смоліч нарадзіўся ў вёсцы Бацэвічы зараз Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і псаломшчыка ў 1891 годзе. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Пінскай духоўнай семінарыі, вышэйшую — у Нова-Александрыйскім сельскагаспадарчым і лесаводчым інстытуце на Украіне. З 1910 года Аркадзь Антонавіч прымае актыўны ўдзел у рэвалюцыйных гуртках, уступае ў Беларускую Сацыялістычную Грамаду. У дваццацігадовым узросце А. Смоліч, улюбёны ў сваю бацькаўшчыну, пачынае збіраць матэрыялы для кнігі «Геаграфія Беларусі». Першы ў гісторыі падручнік па геаграфіі рэспублікі Аркадзь Антонавіч выдаў у Вільна ў 1919 годзе, пазней ён перавыдаваўся ў 1922 і 1923 гадах таксама ў Вільна, а ў 1925 годзе — у Мінску. Па падручніку А. А. Смоліча вучыліся школьнікі і студэнты педвучылішчаў не толькі ў рэспубліцы. Яго кнігамі карысталіся навучэнцы беларускіх школ на Далёкім Усходзе і ў Сібіры.

Дваццатыя гады былі найбольш плённымі ў творчым жыцці маладога вучонага. У 1923 годзе Аркадзя Смоліча запрасілі ў Беларускі дзяржаўны універсітэт у якасці навуковага супрацоўніка, а потым ён выбіраецца дацэнтам кафедры геаграфіі. Праз тры гады савет універсітэта выбірае яго прафесарам гэтай жа кафедры, а з лютага 1927 па ліпень 1930 А. А. Смоліч узначальвае кафедру геаграфіі, выкладае на эканамічным і педагагічным факультэтах.

У гэтыя гады прафесар Смоліч вядзе не толькі выкладчыцкую дзейнасць. Ён удзельнічае ў навуковых экспедыцыях па вывучэнню рэспублікі, працуе ў камісіі па раяніраванню Дзяржплана БССР. У пачатку 1925 года А. А. Смоліч пастановай СНК БССР назначаецца сапраўдным членам Інстытута беларускай культуры і намеснікам старшыні гэтага інстытута. У Інбелкульце, які вырас потым у Акадэмію навук БССР, ён арганізуе навукова-даследчую і выдавецкую дзейнасць, узначальвае сельскагаспадарчую камісію і бюро краязнаўства. З-пад яго пяра выходзіць каля 20 навуковых прац. Уся дзейнасць прафесара А. А. Смоліча накіравана на тое, каб «Беларусь перастала быць краем невядомым для саміх беларусаў».

У 1930 годзе Геаграфічнае таварыста СССР за работы па сельскагаспадарчаму раяніраванню і карту шчыльнасці насельніцтва Беларусі ўзнагародзіла Аркадзя Антонавіча Малым залатым медалём — адной з вышэйшых узнагарод за дасягненні ў развіцці геаграфіі. У водгуку на работы Смоліча М. П. Сямёнаў-Цянь-Шанскі пісаў, што яны «павінны парадаваць кожнага сапраўднага географа», што прафесар А. Смоліч «уводзіць эканамічную геаграфію ў кола геаграфічных навук», цесна звязаўшы глебу, геаграфію, рэльеф тэрыторыі і іншыя элементы геаграфічнага ландшафту са шматлікімі эканамічнымі прыкметамі.

Навуковая работа Аркадзя Антонавіча Смоліча перарвалася ў 1930 годзе. У сувязі са справай беларускіх нацыянал-дэмакратаў ён быў па пастанове камісіі АГПУ адміністрацыйна сасланы на пяць гадоў у Уральскую вобласць. З мая 1932 года А. А. Смоліч, у якасці ссыльнага, працуе выкладчыкам Ішымскага педагагічнага тэхнікума. Тут ён вядзе геаграфію, курсы ўдасканалення настаўнікаў Чалябінскай і Омскай абласцей.

У 1935 годзе адміністрацыйнаму ссыльнаму Аркадзю Смолічу была прадстаўлена «свабода» з забаронай жыць у Беларусі, у сталіцах Саюзных рэспублік і іншых буйных гарадах краіны. Ехаць не было куды і Смоліч застаецца ў Ішыме.

У 1936 годзе ён правёў невялікае экспедыцыйнае даследаванне і напісаў работу «Зона ліставых лясоў і займішчаў Заходняй Сібіры на мерыдыяне Ішыма». Работа аказалася апошняй і засталася ў рукапісу.

17 ліпеня 1937 года Аркадзь Антонавіч быў арыштаваны органамі НКУС. З Ішыма яго накіравалі ў Омскую турму, адтуль у 1938 годзе ён назаўсёды знікае за калючым дротам аднаго з сібірскіх лагераў.

Дзевятнаццаць гадоў сям'я Смолічаў нічога не ведала пра Аркадзя Антонавіча. Яго жонка, Аляксандра Ігнатаўна, шмат хадайнічала пра мужа, пісала пісьмы Вышынскаму, Калініну, Крупскай, начальнікам усялякіх упраўленняў і аддзелаў лагераў у Маскву, Нарыльск, Омск, Тайшэт. Адказу не было. Ён прыйшоў толькі ў лютым 1957 года. Рашэнне тройкі УНКУС па Омскай вобласці ад 10 чэрвеня 1938 года адменена і справаводства спынена. А праз месяц сям'я атрымала пасведчанне аб смерці прафесара А. А. Смоліча. Гэта здарылася 17 сакавіка 1943 года ў месцах зняволення.

Прайшло трыццаць гадоў. Аркадзь Антонавіч пасмяротна рэабілітаваны, а кнігі яго да гэтага часу ў спецыяльных фондах. Часам «Геаграфію Беларусі» А. А. Смоліча называюць няўдалым вучэбна-метадычным дапаможнікам, і гэта ацэнка пераходзіць з кнігі ў кнігу, магчыма, у аўтараў, якія яе ніколі не чыталі.

Справа нашага часу — даць грамадскую характарыстыку навуковай дзейнасці таленавітага беларускага вучонага Аркадзя Антонавіча Смоліча, апраўдаць яго добрае імя. Зрабіць гэта трэба яшчэ і таму, што ён быў першым беларускім географам — самым яркім, самым таленавітым даследчыкам беларускай геаграфіі 20-х гадоў.

**А. БОЛАТАЎ,**
**Г. РЫДЗЕЎСКІ,**
**студэнты IV курса геафака, сапраўдныя члены Геаграфічнага таварыства БССР.**

# АЎДЫТОРЫЯ № 7

*Некалі гэты чалавек наводзіў страх на добрапрыстойных амерыканскіх абывацеляў, стаў ідалам для іх дзяцей. Ды і сёння пра яго нярэдка гавораць як пра чалавека, які здзейсніў рэвалюцыю ў музыцы і адзенні.*

*Ужо больш за дзесяць гадоў «Караля» няма ў жывых, але прыхільнікі, якія не жадаюць у гэта верыць, працягваюць пісаць пісьмы свайму куміру, а палац «Караля» — велізарны дом з белымі калонамі — гасцінна расчыняе для іх свае кутыя жалезныя вароты (за 11 долараў 95 цэнтаў можна цалкам агледзець гэты прыстанак паўбога, паўчалавека).*



# ЭЛВІС ПРЭСЛІ,

## або Пра што «спяваў» палкоўнік Берроуз

А напачатку такія пакоі Элвіс Прэслі мог бачыць хіба толькі ў сне. Дзяцінства хлопчыка праходзіла ў складаных умовах: матэрыяльныя цяжкасці сям'і, пастаянныя пераезды ў пошуках хлеба надзённага. Нарэшце Прэслі аселі ў Мэмфісе.

І тут Элвісу пашанцавала. Менавіта ў Мэмфісе ён ступіў на першую прыступку той лесвіцы, якая ў хуткім часе прывяла яго на вяршыню музычнага Алімпа. А здарылася гэта так. Аднойчы дзевятнаццацігадовы Элвіс вырашыў зрабіць падарунак на дзень нараджэння сваёй маці. У той час было модным запісваць віншаванні на пласцінкі. Юнак так і паступіў. У бліжэйшым салоне грамзапісу ён напеў дзве любімыя мелодыі маці. Гэта каштавала яму 4 долары. А Сэму Філіпсу, кіраўніку мемфіскага аддзялення фірмы грамзапісу «Сан Рэкордс»,— бяссоннай ночы і многіх гадзін разважанняў. Справа ў тым, што аднойчы [illegible]арам Філіпс вырашыў паслухаць якую-небудзь пласцінку. Зусім выпадкова ёю аказаўся элвісаўскі падарунак маці, а таксама выпадкова Філіпс пракруціў у больш хуткім тэмпе. Голас спевака, асабліва тэмбр, здаліся яму даволі цікавымі. Зразумела, не хапала школы, майстэрства, у хуткім тэмпе песні гучалі лепш, чым у арыгінальным варыянце. «І ўсё-такі ў гэтага хлопца нешта ёсць»,— сказаў сабе Філіпс.

Лёс Прэслі быў вырашаны. У маі 1954 года ў «Сан Рэкордс» выходзіць яго першая пласцінка, якая называлася «Усё ў парадку, мама». Потым была другая — «Блакітная луна Кентукі». А праз год амерыканская фірма грампласцінак заключыла кантракт з «Сан Рэкордс». У выніку гэтай здзелкі маладая рок-зорка набыла новых гаспадароў, а Сэм Філіпс атрымаў роўна 35 тысяч долараў. Праз некаторы час Філіпс зразумеў, што ўпусціў з рук не тысячы — мільёны. Але было ўжо позна.

Між тым папулярнасць Прэслі ўсё расла. Гэтаму ў нейкай ступені садзейнічаў яго выгляд — простага і мілага юнака, што называецца «свайго хлопца», які адразу спадабаўся мільёнам амерыканцаў, а таксама тое, што, па словах самога Прэслі, у той час, калі ён пачынаў, канкурэнцыя была невялікая.

Безумоўна, у многім дапамаглі спеваку тыя, хто кіраваў справамі музычнага бізнесу. Таму што ў гэты час, як ніколі, моцным быў іх уплыў на творчую манеру і сцэнічнае аблічча выканаўцаў. Для гэтых гандляроў ад музыкі галоўнае — долары. Даволі хутка засвоіў законы шоу-бізнесу і Элвіс Прэслі. У гэтай навуцы ён быў даволі прыкладным і кемлівым вучнем.

Дастаткова было згаснуць зорцы рок-н-рола і Прэслі імгненна мяняе рэпертуар. Цяпер у ім пашлаватыя песні аб каханні. Ён нават спрабуе здымацца ў кіно, стварыўшы на экране тып гэткага «блакітнага» героя, супермэна, які спявае і танцуе. Вось толькі прэса настойліва не хацела заўважыць яго акцёрскія здольнасці.

Калі некаторыя спевакі пачалі ўводзіць у свой рэпертуар сацыяльныя матывы, Элвіс зразумеў, што на гэтым таксама можна выйграць. І на змену сентыментальным рамансам прыходзяць песні з пэўным сацыяльным і палітычным гучаннем. Лепшая з іх — «Гета».

Але хутка ў маладзёжным руху ЗША вызначыўся спад, з'явілася настальгія па старых добрых 50-х. І саракагадовы герой рады старацца. Зноў у модзе скураны камбінезон, стрыжка а-ля Прэслі, а сам Прэслі зноў на музычным Алімпе.

Але за ўсімі гэтымі свядомымі рыўкамі з крайнасці ў крайнасць, пад штучным грымам камерцыі многія музыканты здолелі ўсё ж разгледзець своеасаблівасць элвісаўскага таленту. Аб уздзеянні выканаўчай манеры спевака на іх творчасць гаварылі многія вядомыя людзі. Сярод іх Боб Дзілан і Джон Ленан. «Калі я ўпершыню пачуў Прэслі, я быў шакіраваны,— гаварыў Ленан.— Ён спяваў нестандартным, культываваным голасам, нібы не горлам, а нутром, істотай сваёй». Пад уплывам рок-н-рола Прэслі пачынаў і Ян Гілан.

Калі Элвіс Прэслі памёр ад сардэчнай недастатковасці ў сорак два гады, гэта стала сенсацыяй. Квітнеючы паэт здаваўся ўвасабленнем бадзёрасці і здароўя. Разам з ім загінула вера ў рок-н-рол як эліксір вечнай маладосці. Але яшчэ большай сенсацыяй стала звестка аб тым, што Элвіс Прэслі быў не толькі каралём рок-н-рола, але і... агентам паліцэйскіх упраўленняў Мемфіса і Лос-Анжэлеса і нават ірваўся ў тайныя паведамляльнікі ФБР. Усё гэта даказана дакументамі на 86 старонках, з якімі часопіс «Эуропео» змог пазнаёміцца ў архівах ФБР.

Вось толькі некаторыя цытаты з гэтых дакументаў:

«...Аддаючы належнае шчырасці і добранамернасці Прэслі, патрэбна адзначыць, што ён зусім не той тып, з якім захацеў бы сустрэцца дырэктар. Нельга не заўважыць, што ён носіць валасы да плячэй і надзвычай экстравагантнае адзенне. Прыкладваецца фотаздымак Прэслі, узяты з сённяшняга нумару «Вашынгтон пост»: ён добра паказвае паводзіны Прэслі і яго манеру апранацца».

Гэта спачатку. Але хутка Прэслі, які прапанаваў з мэтай канспірацыі называць яго не інакш як палкоўнік Іон Берроуз, пакарае вышэйшых чыноў ФБР. Чытаем:

«Прэслі лічыць сябе даўнім прыхільнікам Эдгара Гувера і чытаў такія кнігі дырэктара ФБР, як «Майстар абману», «Даследаванні аб камунізме» і «Гувер аб камунізме». Прэслі заявіў, што, на яго думку, ніхто не зрабіў столькі для краіны, як Эдгар Гувер, і што ён лічыць дырэктара ФБР самым вялікім з амерыканцаў, якія жывуць зараз». І далей: «Нягледзячы на свой больш чым незвычайны знешні выгляд, Прэслі сур'ёзны і шчыры хлопец, які заклапочаны праблемамі, што стаяць перад моладдзю. Ён даказаў на ўласным прыкладзе, што Амерыка — гэта краіна вялікіх магчымасцей, таму што здолеў са звычайнага вадзіцеля грузавіка стаць зоркай эстрады. Прэслі прызнаўся, што доўгія валасы і дзіўная манера апранацца — усяго толькі хітрасці яго бізнесу, і прапанаваў указаць на шматлікіх маладых людзей з ліку сваіх сяброў-артыстаў, настроеных супраць усталяванага парадку, хаця з імі ён падтрымліваў даволі сяброўскія адносіны. Прэслі выказаў жаданне далажыць Гуверу, што ён час ад часу кантактуе з людзьмі як з арыстакратычнага свету, так і з тымі, чые інтарэсы не адпавядаюць інтарэсам краіны, што можа ўцягнуць іх у дзейнасць падазронага характару. У сувязі з гэтым ён падручыўся даваць канфедэнцыяльную і сакрэтную інфармацыю. Акрамя таго, ён папрасіў перадаць дырэктару ФБР, што калі ў ФБР узнікне патрэба ў яго паслугах, то ён будзе проста шчаслівы аказаць любую дапамогу».

«...Прэслі зрабіў на нас уражанне шчырага маладога чалавека,— адзначаецца праз некалькі старонак у дакументах ФБР.— Прымаючы да ўвагі занятую ім асобую пазіцыю ў арыстакратычным свеце, яго шчырае жаданне супрацоўнічаць з намі і прызнанне яго заслуг прэзідэнтам Ніксанам, мы прапануем накіраваць яму пісьмо ад імя дырэктара».

У студзені 1971 года на імя выдуманага палкоўніка Іона Берроуза сапраўды прыйшло пісьмо: «... Ваша прыязнае пісьмо аб нашым бюро мы высока ацанілі, і я запэўніваю вас, што мы пастаянна памятаем вашу прапанову аб супрацоўніцтве з намі. Шчыра ваш Эдгар Гувер».

Што гэта было за «супрацоўніцтва» — пакуль невядома. Усё гэта — дзяржаўная тайна. Аднак па выплыўшай раптам з патаемных сховішчаў запісцы можна без цяжкасці здагадацца, аб чым «спяваў» супрацоўнікам ФБР палкоўнік Берроуз.

«Прэслі выказаў думку, што «Бітлз» нясуць адказнасць за многія цяперашнія праблемы моладзі з-за сваіх ганебных антыграмадскіх выступленняў у 60-я гады. Акрамя таго ён заявіў, што Джэйн Фонда і іншыя падобныя да яе прадстаўнікі арыстакратычнага свету атруцілі свядомасць моладзі, ачарнілі Злучаныя Штаты сваімі публічнымі заявамі і сваёй агіднай дзейнасцю».

У той час Джэйн Фонда, «Бітлз» і іншыя выступалі супраць вайны ў В'етнаме.

Але мільёны прыхільнікаў Прэслі нягледзячы на шматлікія доказы не вераць у яго сувязь з ФБР. Неяк Элвіс сказаў: «Я хачу быць добрым прыкладам». Такім ён для іх і застаўся — гэты гладкі, мілы і абаяльны кароль рок-н-рола.

Матэрыял да друку падрыхтаваў
І. ГУКОЎСКІ.









# МІМА—ХОДАМ

*На гэтых здымках вы бачыце ўдзельнікаў музычна-танцавальнага рэвю «Нонстоп — 88», праведзенага не так даўно Рэспубліканскім эксперыментальна-маладзёжным цэнтрам «Арыенцір».*

*«АЛІБІ»*

*Гэты адзіны ў маскоўскай рок-лабараторыі калектыў немасквічоў прынцыпова імкнецца ў кожнай песні «спальваць масты». Іншымі словамі, арганізатар і саліст групы Сяргей Папоў разам са сваімі сябрамі спецыяльна дамагаецца «непраходнасці» (па старых мерках) тэкстаў. Нават сёння ў іх гэта атрымліваецца — выступленняў «Алібі» няма ні на «Мелодыі», ні на тэлебачанні.*

*«БОНДА»*

*На рэкламным плакаце рок-гурта — пацук, які жуе гітару. У гэтым — адносіны да былых нягод з належным пачуццём гумару. Зараз у актыве «Бонды» — выступленні на фестывалях «Літуаніка-86», «Наваполацк-87», І Магілёўскім рок-фестывалі «Дыялог», «Парадзе надзей-88»...*

*«АВІА»,*

*чыя музыка — сплаў новай хвалі, элементаў джазу і традыцыйнага року, панк-року і аптымістычных маршаў на аснове рускіх фальклорных традыцый;*
*чыя эстэтыка — спалучэнне савецкага авангарду першых паслярэвалюцыйных гадоў і самага незвычайнага сучаснага авангарду;*
*чый сцэнічны вобраз — раўнапраўе музыкі, тэкста і руху, гратэск, даведзены да абсурду, шматпланавасць і шматслойнасць дзеяння...*

*«МІРАЖ»*

*Па гучанню арыентуецца на танцавальныя групы накшталт «Модэрн Токінг», чым, пэўна, і тлумачыцца яе папулярнасць. Першы магнітафонны альбом «Зоркі нас чакаюць» атрымаў шырокае распаўсюджанне ў дыскатэках краіны. Зараз група запісвае наступны — «Зноў разам».*

*І. ФЁДАРАВА.*
*Фота А. МАКСІМАВА.*

# З пятага на дзесятае

НОВАЯ пласцінка Элтана Джона «Рэг Страйкс Бэк» выклікала сенсацыю. Перад намі паўстаў зусім іншы Элтан Джон. «Дваццаць гадоў я іграў рок-клоуна,— гаворыць спявак,— зараз я маю намер з гэтым пакончыць». Гэта значыць, што ён ужо не будзе выступаць перад публікай у сваіх маскарадных касцюмах і гіганцкіх «клоунскіх» бацінках, якія так спадабаліся гледачам. Усе гэтыя, гаворачы словамі Элтана Джона, «анучы» былі прадстаўлены на выстаўках розных краін свету, а затым прададзены на лонданскім аўкцыёне.

«Я быў бы вельмі неразумным, калі б не прадаў гэтае адзенне да сваёй смерці,— заўважыў Элтан Джон,— бо, як паказаў аўкцыён, яшчэ пры жыцці магу мець за яго нядрэнныя грошы».

* * *

«Я ВЕЛЬМІ люблю оперу,— сказаў два гады назад у інтэрв'ю спявак «Куін» Фрэдзі Меркюры.— Ужо даўно я мару зрабіць оперна-тэатралізаванае прадстаўленне накont «Ада» Дантэ».

Патрэбна заўважыць, што пакуль сваёй задумкі ён не ажыццявіў. Затое зусім нядаўна пацвердзіў сваю любоў да опернага мастацтва, выпусціўшы альбом пад назвай «Барселона», які ён запісаў сумесна з іспанскай опернай спявачкай Мансерат Кабае.

* * *

ВАКАЛІСТ «металічнай» групы «Твістэд Сістэр» Дзі Снайдзер заканчвае работу над сваім сольным альбомам. Ён заявіў, што ў групу больш не вернецца. Падпісаўшы кантракт з вядомай фірмай грамзапісу «Атлантык», Дзі Снайдзер, напэўна, вырашыў па-сапраўднаму заняцца сваёй сольнай кар'ерай.




БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвона» зорка» МВПА імя Я. Коласа.
5 студзеня.
Зак 1607.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.